Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(55), Ч1, 2009

*УДК 947.0 “192” “364”: 943.8“192”“364”(09)*

# Міхаіл Тухачэўскі і Юзэф Пілсудскі аб вайне 1920 г.

М. М. Мязга

Заключыўшы саюзны дагавор з кіраўніком Украінскай Народнай Рэспублікі С. Пет-люрай, 25 красавіка 1925 г. Ю. Пілсудскі рушыў польскія войскі на Кіеў. Тым самым былі пахаваны спадзяванні на мірнае ўрэгуляванне польска-савецкага канфлікту і пачаўся новы, найбольш востры этап вайны паміж дзвюма краінамі. Вайна паміж савецкай Расіяй і Польшчай аказала вызначальны ўплыў на характар двухбаковых адносін на працягу ўсяго міжваеннага перыяду. Высокая грамадска-палітычная значнасць польска-савецкай вайны 1919–1920 гадоў абумовіла вялікую цікавасць да яе як сярод гісторыкаў савецкай Расіі, так і Польшчы літаральна з моманту яе заканчэння. Гісторыя польска-савецкай вайны стала аб’ектам не толькі навуковага даследавання, але і полем вострай ідэйна-палітычнай барацьбы паміж дзвюма краінамі ў міжваенны час. Як адзначае польскі даследчык В. Рэзмер, ваенная барацьба завяршылася ў ноч з 18 на 19 кастрычніка 1920 г., а ідэалагічная і прапагандысцкая працягвалася на працягу ўсяго міжваеннага часу [1, s. 143]. Гістарычныя даследаванні непазбежна неслі на сабе адбітак гэтай барацьбы. Палітычная злабадзённасць вывучэння гісторыі польска-савецкай вайны абумовіла тое, што ў гэтую справу актыўна ўключыліся дзяржаўныя і ваенныя дзеячы савецкай Расіі і Польшчы.

У дадзеным артыкуле мы ажыццявім спробу параўнальнага аналізу поглядаў і ацэнак на вайну 1919–1920 гадоў, выказаных Ю. Пілсудскім і М. Тухачэўскім у іх працах, прысвечаных гісторыі той вайны. Абодва аўтары былі непасрэднымі ўдзельнікамі вайны 1920 г. У сувязі з гэтым яны добра ведаюць яе ход, механізм прыняцця важнейшых рашэнняў, але, з другога боку, суб’ектыўнае ўспрыманне аўтарамі асабіста перажытых падзей не спрыяла ўсебаковаму і аб’ектыўнаму іх аналізу. На сённяшні дзень адсутнічаюць спецыяльныя даследаванні, у якіх былі б падвергнуты гістарыяграфічнаму разгляду работы М. Тухачэўскага і Ю. Пілсудскага. Прычым на гэтыя работы вельмі мала звярталі ўвагу гісторыкі, якія даследавалі савецка-польскую вайну як у СССР [2, с. 135–137], так і на постсавецкай прасторы [3; 4].

М. Тухачэўскі уступіў на пасаду камандуючага Заходнім фронтам 29 красавіка 1920 г. Ён справядліва адзначае, што менавіта Заходні фронт у той момант з’яўляўся галоўным фронтам для савецкай Расіі. Гэта дазволіла Заходняму фронту, па словах Тухачэўскага, дасягнуць, ва ўсякім разе, роўнасці сіл з праціўнікам ужо да пачатку майскай аперацыі 1920 г. [5, с. 34, 37]. Ю. Пілсудскі дае іншую ацэнку суадносін сіл. Па яго словах, на ўсім савецка-польскім фронце польская армія налічвала не больш чым 200 тыс. чалавек, і Тухачэўскі меў яўную колькасную перавагу над палякамі на сваім фронце. Па словах кіраўніка польскай дзяржавы, на беларускім напрамку польскія войскі налічвалі каля 110–120 тыс. чалавек супраць 200 тыс. савецкіх войскаў [6, с. 104–105]. На наш погляд, бліжэй да ісціны пры ацэнцы сіл бакоў быў Ю. Пілсудскі. Нават калі звярнуцца да найбольш грунтоўных выданняў савецкага часу, то і ў іх прызнаецца наяўнасць колькаснай перавагі ў паўтара разы Заходняга фронту над супрацьстаячымі польскімі войскамі яшчэ перад пачаткам майскай аперацыі [7, с. 268–269]. У выданні “Гісторыя грамадзянскай вайны ў СССР” прыводзяцца наступныя дадзеныя аб колькасным складзе савецкіх і польскіх войскаў напярэдадні гэтай аперацыі: савецкі Заходні фронт – 81,5 тыс. штыкоў і шабляў, польскі Паўночна-Усходні фронт – 63 тыс. штыкоў і шабляў [2, с. 96]. Факт колькаснай перавагі савецкіх войскаў пацвярджаюць даследаванні і сучасных расійскіх гісторыкаў. М. Мельцюхоў называе наступныя лічбы колькасці савецкіх і польскіх войскаў на Беларусі напярэдадні майскага наступлення: 131674 і 67645 байцоў адпаведна [3, с. 44].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Да ліпеньскай аперацыі колькасны склад Заходняга фронту значна павялічыўся. Паміж майскай і ліпеньскай аперацыямі ён атрымаў больш 170 тыс. чалавек папаўнення, яго агульны колькасны склад дасягнуў 447 тыс. чалавек, але з іх толькі 92 тыс. адносіліся да актыўных штыкоў і шабляў. Польскія войскі, якія супрацьстаялі тады Заходняму фронту, налічвалі 70–72 тыс. штыкоў і шабляў [2, с. 135–137]. М. Мельцюхоў у сваёй манаграфіі называе іншыя суадносіны сіл на савецка-польскім фронце ў Беларусі: Чырвоная армія – 152027 байцоў, польская – 75300, але і ён пацвярджае значную колькасную перавагу Заходняга фронту [3, с. 66]. У нас ёсць падставы пагадзіцца з пунктам гледжання Ю. Пілсудскага, што ў ходзе баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў 1920 г. савецкія войскі мелі значную колькасную перавагу над польскімі. Гэта ў значнай ступені было звязана з тым, што савецкае камандаванне мела магчымасць перакідваць сілы з іншых франтоў. Тухачэўскі высока ацэньвае баяздольнасць менавіта тых вайсковых злучэнняў, якія прыбылі на Заходні фронт з іншых месцаў. У той жа час войскі, якія пастаянна знаходзіліся на Заходнім фронце, не вызначаліся высокай баяздольнасцю. Пры гэтым М. Тухачэўскі прызнае якасную перавагу польскай арміі. Ён піша, што стан польскіх войскаў у страявых адносінах быў вышэйшы, чым савецкіх. Палякі таксама былі лепш узброены і абмундзіраваны [5, с. 36, 37].

Апісанне ваенных дзеянняў у 1920 г. М. Тухачэўскі і Ю. Пілсудскі пачынаюць з аналізу майскай аперацыі Заходняга фронту ў 1920 г. Абодва аўтары даюць фактычна аднолькавую інтэрпрэтацыю плана аперацыі савецкіх войскаў. Тухачэўскі піша, што меўся на ўвазе прарыў польскага фронту праз гэтак званыя "Смаленскія вароты" і разгром левага флангу польскай арміі. Пасля гэтага намячалася прыціснуць палякаў да Пінскіх балот [5, с. 38]. Ю. Пілсудскі адзначае, што план майскай аперацыі Заходняга фронту фактычна быў такі ж, як і ў ліпеньскай і пераследаваў далёка ідучыя мэты [6, с. 123]. Як вядома, мэта наступлення савецкіх войскаў у Беларусі, якое пачалося ў ліпені 1920 г., заключалася ў тым, как разграміць левы фланг польскага Паўночна-Усходняга фронту і прыціснуць яго галоўныя сілы да Палескіх балот. Калі пры характарыстыцы плана майскай аперацыі пазіцыі М. Тухачэўскага і Ю. Пілсудскага дастаткова блізкія, то яны карэнным чынам разыходзяцца пры ацэнцы вынікаў гэтых баёў. М. Тухачэўскі адзначае два станоўчыя вынікі майскага наступлення Заходняга фронту: 1) былі заняты гэтак званыя "Смаленскія вароты"; 2) польскае камандаванне перакінула значныя сілы з Украіны на Беларусь, што аблегчыла становішча на Паўднёва-Заходнім фронце [5, с. 40, 42]. Ю. Пілсудскі рашуча не згаджаецца з гэтымі меркаваннямі М. Тухачэўскага. Па яго словах, палякі не ставілі сваёй задачай у ходзе контрудара вярнуць "Смаленскія вароты". Пілсудскі разлічваў ударамі па зыходзячыхся напрамках з захаду і поўдня акружыць ударную групоўку Заходняга фронту. Пры гэтым ён прызнае, што вырашыць гэтую задачу не ўдалося. Што датычыцца "Смаленскіх варот", то Пілсудскі, нябыта, аддаў загад польскай арміі спыніцца з выхадам да Бярэзінскіх балот, хаця праціўнік і не прымушаў да гэтага [6, с. 127, 128]. Улічваючы выгаднае становішча "Смаленскіх варот" як плацдарма для наступлення і тое, што галоўны ўдар Заходняга фронту 4 ліпеня быў нанесены менавіта з гэтага раёна, цяжка паверыць у шчырасць прыведзеных вышэй ацэнак Ю. Пілсудскага.

Адносна перакіду польскіх войскаў з Украіны Ю. Пілсудскі адзначае, што іх колькасць там зменшылася нязначна, толькі на адну дывізію. З Украіны на Беларусь было перакінута 2,5 польскія дывізіі, але на Украіну з рэзерву вярхоўнага камандавання былі перададзены 1 дывізія і 3 асобныя палкі [6, с. 130]. У гэтай сувязі Пілсудскаму можна запярэчыць, што пры адсутнасці наступлення Заходняга фронту тыя войскі, якія прыбылі на Украіну са стратэгічнага рэзерву, не замянілі б перакінутыя на Беларусь дывізіі (і то часткова), а ўзмацнілі б польскую групоўку, якая супрацьстаяла Паўднёва-Заходняму фронту.

У якасці асноўнай прычыны няўдачы наступлення Заходняга фронту ў маі 1920 г. М. Тухачэўскі называе перакід польскіх войскаў з Украіны на Беларусь. На наш погляд, яўна неправамерна тлумачыць правал наступлення Заходняга фронту ў маі 1920 г. толькі гэтым фактарам. Як адну з асноўных прычын паражэння Заходняга фронту трэба разглядаць якасную

перавагу польскай арміі, што прызнае і сам Тухачэўскі. Яшчэ адна важная прычына няўдачы – паспешлівасць пры падрыхтоўцы наступальнай аперацыі, незавершанасць канцэнтрацыі ўсіх войскаў, якія перакідваліся ў распараджэнне Заходняга фронту [2, с. 99; 7, с. 286].

Гаворачы пра падрыхтоўку ліпеньскага наступлення, М. Тухачэўскі адзначае слабасць польскай абароны ў Беларусі, якую бачыць перш за ўсё ў тым, што польскія войскі былі выцягнуты раўнамерна ўздоўж лініі фронту і іх немагчыма было сканцэнтраваць у кароткі час на рашаючым напрамку [5, с. 36–37]. Пілсудскі прызнае, што польскія войскі мелі менавіта такую групоўку і згаджаецца, што польскі кардон мог быць лёгка прарваны ў тым ці іншым месцы. Але, па яго словах, спецыфіка вайны з савецкай Расіяй заключалася ў тым, што з-за нешматлікасці войскаў немагчыма было стварыць непераадольную абарону па лініі фронту [6, с. 105]. Фактычна польскае камандаванне разлічвала адбіць савецкае наступленне, не ўтрымліваючы лінію фронту, а наносячы моцныя контрудары па наступаючых савецкіх войсках. Але з працы Ю. Пілсудскага вынікае, што вялікіх шансаў справіцца з савецкім наступленнем з дапамогаю контрудараў не было, бо польскі Паўночна-Усходні фронт не меў глыбокіх рэзерваў для контрманеўру [6, с. 138]. Па словах Ю. Пілсудскага, гэта было звязана з тым, што пасля паспяховага адбіцця майскага наступлення Заходняга фронту, ён сканцэнтраваў асноўныя сілы польскай арміі, каб спыніць савецкае наступленне на Украіне. Толькі пасля вырашэння гэтай задачы польскае камандаванне мела намер перакінуць большую частку сваіх сіл на Беларусь, каб "перайсці ў рашучае наступленне там, дзе канцэнтраваліся самыя буйныя сілы праціўніка" [6, с. 133]. Тым самым ён пацвярджае тэзіс М. Тухачэўскага, згодна якому галоўная стратэгічная задача ў вайне з Польшчай у 1920 г. ускладалася на Заходні фронт.

М. Тухачэўскі і Ю. Пілсудскі шмат пішуць пра план савецкага наступлення ў Беларусі летам 1920 г. Камандуючы Заходнім фронтам адзначае свой намер, гэтак жа, як і ў маі, прарваць паўночны фланг польскага фронту і прыціснуць галоўныя сілы польскай арміі да Палескіх балот [5, с. 49]. Выбар гэтага напрамку галоўнага ўдару М. Тухачэўскі тлумачыць не толькі ваеннымі, але і палітычнымі матывамі. Ён піша: "Варожая палякам Літва, у выпадку нашага руху наперад, з поспехам магла забяспечыць наш фланг. Далей гэтую задачу магла выконваць Усходняя Прусія, нават без усялякай на тое яе згоды" [5, с. 38]. Зыходзячы з гэтай задумы, М. Тухачэўскі сканцэнтраваў галоўныя сілы Заходняга фронту на паўночным фланзе і дабіўся тут вялікай колькаснай перавагі над праціўнікам. Уменне Тухачэўскага масіраваць сілы на галоўным напрамку адзначае і Ю. Пілсудскі. Ён піша, што савецкі военачальнік не ўпусціў "ні адной магчымасці ўзмацніць гэты рашаючы напрамак" [6, с. 137]. Сапраўды, паўночная ўдарная групоўка Заходняга фронту налічвала 104,4 тыс. байцоў і мела значную перавагу над супрацьстаячай польскай арміяй, у радах якой было 35,1 тыс. байцоў [3, с. 67].

Разглядаючы пачатковы этап аперацыі Заходняга фронту, Ю. Пілсудскі выказвае меркаванне, што задача савецкіх войскаў заключалася ў тым, каб акружыць 1-ю польскую армію. Але вырашыць гэтую задачу Заходні фронт не змог [6, с. 160]. М. Тухачэўскі не прыгадвае планаў па акружэнню гэтай арміі ў першыя дні наступлення. Думаем, што тут савецкі ваеначальнік проста не хоча гаварыць пра сваю няўдачу. Савецкая гістарыяграфія прызнавала яе. У савецкіх фундаментальных выданнях па гісторыі грамадзянскай вайны адзначалася, што ўдарная групоўка Заходняга фронту на працягу першых трох дзён аперацыі павінна была акружыць і знішчыць галоўныя сілы паўночнага флангу польскай арміі ў Беларусі. Але савецкае камандаванне не заўважыла адыходу 1-й польскай арміі, і яна пазбегла акружэння [2, с. 137–138]. М. Мельцюхоў указвае, што план акружэння 1-й польскай арміі пацярпеў няўдачу, бо камандаванне Заходняга фронту дапусціла сур'ёзныя пралікі пры планаванні аперацыі: групоўка савецкіх войскаў, якая павінна была ажыццявіць абыход паўночнага флангу польскай арміі, аказалася слабейшай за тую, якая наносіла франтальны ўдар [3, с. 68]. Нягледзячы на тое, што 1-я польская армія змагла пазбегнуць акружэння, яе адыход усё ж меў адмоўны ўплыў на ўстойлівасць польскага фронту ў Беларусі. Па словах Пілсудскага, у выніку памылак камандавання 1-я польская армія ў ходзе адыходу зрушылася на поўдзень. Гэта дало магчымасць савецкім войскам ажыццявіць

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

абыход паўночнага флангу палякаў [6, с. 187].

Абодва военачальнікі адзначаюць, што польскія войскі паспрабавалі затрымаць савецкае наступленне на лініі германскіх акопаў першай сусветнай вайны. М. Тухачэўскі піша, што 15-я савецкая армія сустрэла тут жорсткі адпор. Асабліва ўпартыя баі разгарэліся ў раёне Смаргоні. У гэтай сітуацыі поспех быў дасягнуты войскамі Заходняга фронту на крайнім паўночным фланзе, дзе 4-я армія прайшла праз практычна не занятую польскімі войскамі тэрыторыю. Поспеху савецкіх войск садзейнічала і тое, што супраць палякаў выступіла Літва, калі пераканалася ў паспяховасці савецкага наступлення [5, с. 55].

Пасля ўзяцця Вільні савецкія войскі пачалі бесперапынны рух да Віслы. Імклівае наступленне Заходняга фронту ў гэтыя дні высока ацэньвае і Ю. Пілсудскі. Ён піша, што савецкія войскі праходзілі за дзень з баямі каля 20 км. і “такімі тэмпамі могуць ганарыцца і армія, і яе камандуючы”. Прычым, галоўную ролю ў гэтым наступленні адыгрывалі 4-я армія і 3-і конны корпус. Па словах Пілсудскага, з моманту ўзяцця Вільні ўсе спробы спыніць наступленне савецкіх войскаў цярпелі няўдачу з-за таго, што 4-я армія кожны раз абыходзіла паўночны польскі фланг [6, с. 203, 202]. Адпаведна, на другасную ролю пераходзіць у гэтым наступленні 15-я армія, якая па плану Тухачэўскага павінна была выконваць ролю наступальнага “тарана”. Гэтую ролю яна выканала фактычна толькі пры прарыве польскага фронту ў пачатку наступлення. Пілсудскі лічыць, што далей дзеянні гэтай самай моцнай арміі Заходняга фронту былі няўдалымі, бо пад Мінскам яна нанесла ўдар у пустату, а пад Вільняй спазнілася прыняць удзел у баях [6, с. 278].

Разыходжанні ў двух аўтараў выяўляюцца пры апісанні баёў на лініі рэк Заходні Буг і Нёман. М. Тухачэўскі піша, што палякі канцэнтравалі свае войскі ў раёне Гродна для нанясення моцнага контрудара [5, с. 64]. Ю. Пілсудскі адзначае, што ён планаваў сабраць буйныя польскія сілы на поўнач ад Брэста, каб адсюль нанесці ўдар па паўночнаму флангу Заходняга фронту. Але генерал Сікорскі не выканаў свайго абяцання ўтрымаць Брэст на працягу адзінаццаці дзён. Ужо 1 жніўня Брэст нечакана быў узяты Чырвонай Арміяй. Гэта зрабіла немагчымым нанясенне контрудара [6, с. 209–212]. У пацверджанне версіі Ю. Пілсудскага мы можам спаслацца на тое, што 27 ліпеня ім была выдадзена дырэктыва, якая прадугледжвала нанясенне контрудара ад Брэста на поўнач [3, с. 77]. На думку Ю. Пілсудскага, з выхадам савецкіх войскаў на лінію Заходняга Буга ў стратэгічнай сітуацыі з’явіліся новыя моманты, спрыяльныя для польскай арміі: Палескія балоты перасталі падзяляць тэатр савецка-польскай вайны на дзве ізаляваныя часткі і з’явіліся значна лепшыя магчымасці для манеўру сіламі [6, с. 209–212]. Сапраўды, гэты фактар моцна паўплывае на зыход бітвы на Вісле.

З пачаткам непасрэднага наступлення на Варшаву вельмі важным становіцца пытанне аб узаемадзеянні Заходняга і Паўднёва-Заходняга савецкіх франтоў. М. Тухачэўскі піша, што ён яшчэ ў пачатку жніўня настойваў на перадачы ад паўднёвага суседа 12-й і 1-й коннай армій. Па словах камандуючага Заходнім фронтам, гэта было асабліва важна ў той момант, бо з уступленнем на этнічныя польскія землі суадносіны сіл змяніліся на карысць праціўніка. Заходні фронт налічваў толькі 40 тысяч штыкоў і шабляў, а супрацьстаячыя яму польскія войскі – 70 тысяч. Адсутнасць узаемадзеяння Заходняга і Паўднёва-Заходняга франтоў, лічыць Тухачэўскі, было галоўнай прычынай паражэння Чырвонай Арміі пад Варшавай. Загад аб перадачы Заходняму фронту 12-й і 1-й коннай армій моцна спазніўся, да таго ж, гэтыя арміі вельмі няспешна рухаліся ў паласу Заходняга фронту [5, с. 74, 72, 75, 82]. Новыя работы расійскіх гісторыкаў паказваюць, што польскія войскі сапраўды мелі колькасную перавагу, але яна была нязначнай: 107,9 штыкоў і шабляў у палякаў супраць 101,3 тыс. у Заходняга фронту [3, с. 81, 85]. М. Тухачэўскі высока ацэньвае тую перагрупіроўку польскіх войскаў, якая была праведзена ў ходзе бітвы на Вісле. Па яго словах, польскае камандаванне зрабіла правільную выснову, што лёс Польшчы вырашаецца на Вісле і падцягнула сюды ўсе свае сілы, у тым ліку зняло і амаль усе злучэнні з львоўскага напрамку. У выніку склалася сітуацыя, калі супраць Заходняга фронту дзейнічала амаль уся польская армія: з 23 польскіх дывізій на варшаўскім напрамку было сканцэнтравана 20 [2, с. 154].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

М. Тухачэўскі называе яшчэ некалькі прычын, якія, на яго думку, абумовілі паражэнне Чырвонай Арміі на Вісле. Да іх належала адсутнасць сучасных сродкаў сувязі, у выніку чаго камандаванне Заходняга фронту толькі 18 жніўня даведалася пра польскае контрнаступленне з размовы з камандуючым 16-й арміяй. Мазырская група, па якой прыйшоўся галоўны ўдар праціўніка, увогуле не далажыла пра польскае наступленне. Але дакументы сведчаць, што М. Тухачэўскі ўжо ў 2 гадзіны 30 хвілін 17 жніўня дакладаў глаўкаму аб польскім наступленні [8, с. 657–658]. Таму нельга гаварыць пра тое, што камандаванне Заходняга фронту з вялікім спазненнем атрымала інфармацыю аб польскім наступленні. Таксама М. Тухачэўскі адзначае нізкую падрыхтаванасць многіх камандзіраў Чырвонай арміі [5, с. 71–73, 79, 83–84]. Але ён не ўлічвае такой важнай прычыны паражэння савецкіх войскаў на Вісле, як недаацэнка праціўніка. Ён пастаянна падкрэсліваў у сваіх данясеннях, што польская армія поўнасцю разбіта і дэмаралізавана. На самой справе, як адзначыў у размове з М. Тухачэўскім 10 жніўня 1920 г. галоўнакамандуючы С. Каменеў, польская армія адступіла за Буг дастаткова планамерна [8, с. 648–649].

Ю. Пілсудскі са свайго боку лічыць дзеянні савецкага Заходняга фронту ў ходзе Варшаўскай аперацыі памылковымі і ў гэтых памылках, а не ў колькаснай перавазе палякаў, якой, па яго словах, не было, бачыць прычыны паражэння фронту. На думку Пілсудскага, Тухачэўскі не праявіў належнага імкнення да арганізацыі ўзаемадзеяння з паўднёвым суседам. Яму трэба было пачакаць суседзяў, а можа нават дапамагчы ім, а не скардзіцца потым на адсутнасць дапамогі з поўдня, калі пачалося рашаючае наступленне на Віслу. Другая памылка камандавання Заходняга фронту, лічыць Пілсудскі, заключалася ў тым, што дзве савецкія арміі ў час бітвы на Вісле былі накіраваны не для непасрэднай атакі супрацьстаячай польскай групоўкі, а ў доўгі марш з мэтаю фарсіравання Віслы [6, с. 215, 232]. Сапраўды, удар галоўных сіл Заходняга фронту фактычна прыйшоўся па пустым месцы. М. Тухачэўскі памылкова лічыў, што галоўныя сілы палякаў сканцэнтраваны на поўнач ад Варшавы і Заходняга Буга. Ён настойваў на гэтым пункце гледжання ў час размовы з галоўнакамандуючым С. Каменевым 10 жніўня 1920 г., і глаўкам даў камандуючаму Заходняга фронту свабоду дзеянняў [8, с. 650]. Заходні фронт накіраваў свой галоўны ўдар на поўнач ад Буга. На самой справе, палякі канцэнтравалі свае асноўныя сілы на поўдзень ад гэтай ракі. У выніку склалася сітуацыя, калі супраць Мазырскай групы колькасцю ў 4,5 тыс. чалавек дзейнічала польская групоўка ў 38 тыс. [2, с. 155].

М. Тухачэўскі імкнецца ўсяляк зменшыць маштабы паражэння савецкіх войскаў на Вісле. Ён гаворыць нават пра магчымасць новага наступлення Заходняга фронту праз 2–3 тыдні пасля бітвы на Вісле, але яно не адбылося, бо войскі былі не абмундзіраваны і не абуты. Цяжкае становішча з матэрыяльным забеспячэннем фронта, па словах М. Тухачэўскага, не дазволіла спыніць польскае наступленне на лініі Гродна-Брэст [5, с. 85–86]. Напэўна, да гэтага прывяло і тое, што з-за вялікіх страт Заходняга фронту ў бітве на Вісле суадносіны сіл яшчэ больш змяніліся на карысць палякаў. Толькі палоннымі ён страціў каля 60 тыс. чалавек. У выніку 1 верасня Заходні фронт налічваў 96 тыс. байцоў, а супрацьстаяўшыя яму польскія войскі – 121 тыс. [3, с. 95]. Л. Троцкі назваў адступленне савецкіх войск ад Віслы катастрафічным [9, с. 435].

У работах М. Тухачэўскага і Ю. Пілсудскага вялікая ўвага надаецца пытанню аб экспарце сацыялістычнай рэвалюцыі на штыках Чырвонай Арміі ў Польшчу. Камандуючы савецкім Заходнім фронтам лічыць, што меліся перадумовы для перамогі ў Польшчы сацыялістычнай рэвалюцыі. Па яго словах, назіраўся магутны рух польскіх рабочых і батракоў, і ён адвяргае тэзіс аб абуджэнні нацыянальнага пачуцця ў польскага рабочага класа ва ўмовах наступлення Чырвонай Арміі на Варшаву. М. Тухачэўскі лічыць, што разлік на польскую рэвалюцыю, калі б не паражэнне Чырвонай Арміі на Вісле, цалкам апраўдаўся б. А далей, як піша М. Тухачэўскі, "рэвалюцыя ахапіла б вогненным полымем увесь еўрапейскі кантынент" [5, с. 60–61, 63]. Безумоўна, немагчыма адмаўляць уздым патрыятычных настрояў у Польшчы ў сувязі з наступленнем Чырвонай Арміі. Нават у афіцыёзных савецкіх выданнях адзначаецца, што правячым колам Польшчы ўдалося распаліць "нацыяналістычны ўгар

унутры краіны" [7, с. 286]. Як бачым, М. Тухачэўскі, у адрозненне ад больш позняй савецкай гістарыяграфіі, не адвяргае того факту, што Чырвоная Армія мела намер на штыках прынесці рэвалюцыю ў Польшчу. Гэта пацвярджаюць шматлікія даследаванні і дакументы. Так, Л. Троцкі, выступаючы 10 мая 1920 г. на мітынгу ў Гомелі, закончыў сваю прамову словамі: "І наша задача цяпер адсячы галаву агрэсіўнаму польскаму арлу і тым самым дапамагчы польскім рабочым і сялянам узняць над Польскаю рэспублікай сцяг, на якім будуць, як і ў нас, сімвалы працы [10, с. 296]. Такі ж заклік да пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы ўтрымлівае і Маніфест УЦВК ад 7 мая 1920 г.: "Няхай жыве мір паміж працоўнымі масамі Польшчы і Расіі! Няхай жыве свабодная рабочая і сялянская Польшча!" [11, с. 107].

Зусім па-іншаму ацэньвае перспектывы сацыялістычнай рэвалюцыі ў Польшчы Ю. Пілсудскі. Ён адзначае, што, паколькі рэвалюцыю ў Польшчу трэба было несці на штыках, то наўрад ці можна гаварыць аб яе ўнутраных перадумовах. Гэта рэвалюцыя так і не знайшла водгуку ўнутры краіны. Хаця кіраўнік польскай дзяржавы прызнае, што ва ўмовах ваенных паражэнняў яму шмат даводзілася займацца "ўнутраным фронтам" [6, с. 264–265, 208]. Гэта ўскоснае сведчанне таго, што значныя антыўрадавыя настроі ў краіне былі. Іншае пытанне, наколькі яны супадалі з імкненнем да сацыялізму. Даволі красамоўныя сведчанні стаўлення насельніцтва Польшчы да Чырвонай Арміі ўтрымлівае тэлеграма члена РВС 16-й арміі Г. Пятакова Л. Троцкаму ад 28 жніўня 1920 г. У ёй адзначаецца: "Важным фактарам, які ўсугубіў паніку ў радах арміі пры адступленні, была партызанская вайна ў насельніцтва Седлецкай губ. … Насельніцтва Седлецкай губерні адносілася да нас рэзка варожа, адмаўляючыся нават даваць ваду адступаючым стомленым часцям. У многіх выпадках адступаючыя часці вялі ар'ергардныя баі з мясцовым насельніцтвам …" [12, с. 5].

Ю. Пілсудскі адзначае яшчэ адзін важны палітычны фактар, які істотна паўплываў на ход вайны і які поўнасцю абмінае М. Тухачэўскі. Гаворка ідзе пра рост нацыянальнага патрыятызму ў расійскім грамадстве і ў Чырвонай Арміі ў сувязі з узяццем палякамі Кіева. Гэта, па словах Ю. Пілсудскага, "спрыяла добраахвотнаму ўступленню ў Чырвоную Армію вялікай колькасці афіцэраў з толькі што разбітай арміі Дзенікіна" [6, с. 197–198].

У цэлым у сваіх работах Ю. Пілсудскі і М. Тухачэўскі асноўную ўвагу надаюць аналізу ходу ваенных дзеянняў. Іх працы даюць магчымасць сфарміраваць уяўленне аб падрыхтоўцы і ходзе майскай і ліпеньскай аперацый Заходняга фронту. Найбольш дэталёва прасочаны ход бітвы на Вісле. Кожны з аўтараў імкнецца ў найбольш спрыяльным святле прадставіць дзеянні войскаў пад сваім камандаваннем, хаця прызнаюцца і пэўныя дасягненні праціўніка ў ваенным майстэрстве. З палітычных пытанняў М. Тухачэўскі і Ю. Пілсудскі закранаюць перш за ўсё праблему пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы. Тут іх пункты гледжання рэзка разыходзяцца, як і ў пытанні аб ролі рускага і польскага патрыятызму ў ходзе вайны.

**Abstract.** The paper presents comparative analysis of concepts and estimations of the Polish-Soviet war of 1919-1920 given in the works by M.Tuhacheuski who was Commander of the Soviet Western Front at that time and the leader of the Polish state at that time Joseph Pilsudski.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

### Літаратура

1. Rezmer, W. Pokoj czy dalzha wojna polsko-sowiecka? [Тэкст] // Traktat ryski 1921 roku po 75 latach. / Studzia pod redakcją M. Wojciechowskiego. – Torun, 1998.

2. История гражданской войны в СССР. [Текст]. В 5 т. – М., 1960. – Т.5.

3. Мельтюхов, М. И. Советско-польские войны. Военно-политическое противостояние 1918–1939 гг. / М. И. Мельтюхов. – М., 2001.

4. Михутина, И. В. Польско-советская война 1919–1920 гг. [Текст] / И. В. Михутина. – М, 1994.

5. Тухачевский, М. Поход на Вислу. [Текст] // Тухачевский, М. Поход на Вислу. Пилсудский, Ю. Война 1920 г. – М., 1992. – С. 3–88.

6. Пилсудский, Ю. Война 1920 г. [Текст] // Тухачевский, М. Поход на Вислу. Пилсудский, Ю. Война 1920 г. – М., 1992. – С.89–320.

7. Гражданская война в СССР. [Текст]. В 2 т. – М., 1986. – Т.2.

8. Директивы главного командования Красной Армии. [Текст]. – М., 1969.

9. Троцкий, Л. Моя жизнь. [Текст] / Л. Троцкий – М., 1991.

10. Краснов, В. Г., Дайнес, В. Ю. Неизвестный Троцкий. Красный Бонапарт. Документы. Мнения. Размышления. [Текст] / В. Г. Краснов, В. Ю.Дайнес – М., 2000.

11. "Красная книга". Сборник дипломатических документов о русско-польских отношениях 1918–1920 гг. [Текст]. – М., 1920.

12. Польско-советская война 1919–1920. Раннее не опубликованные документы и материалы. [Текст]. – М., 1994. – Ч. 2.

Гомельскі дзяржаўны
універсітэт імя Ф. Скарыны

Поступило 16.06.08

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ